**Альшэўская, Т.** Афіцэрамі нараджаюцца / Т. Альшэўская // Родныя вытокі. — 2010. — 13 кастр. — С. 5.

**АФІЦЭРАМІ НАРАДЖАЮЦЦА**



Афіцэрамі не становяцца – імі нараджаюцца, калі мець на ўвазе не колькасць зорачак на пагонах, а саму сутнасць афіцэрскага звання. Афіцэр – гэта камандзір, які адказвае за захаванасць жыццяў асабовага саставу даверенага яму падраздзялення. Сапраўдны афіцэр – гэта чалавек, які мае асаблівы гонар, выхаванне, выпраўку. Той, хто прыйшоў у гэту прафесію па прызванні, афіцэрам застаееца назаўсёды.

Яўген Сакалоўскі яшчэ заспеў той час, калі не служыць у арміі было за ганьбу, насіць афіцэрскія пагоны лічылася за гонар і большасць хлопцаў імкнулася паступіць у ваенныя вучылішчы. Сакалоўскі адразу пасля заканчэння Параф'янаўскай СШ паступіў у Ленінградскае артылерыйскае вучылішча. Першым месцам службы стала Забайкалле. Там разгортваўся корпус хуткага рэагавання. Асабовы састаў для двух штурмавых палкоў набіралі з розных часцей. У адну з іх трапіў малады лейтэнант. Афіцэраў было мала, замены Сакалоўскі не меў і таму, здаралася, у часці з салдатамі знаходзіўся круглыя суткі, адсыпаўся на нарадах. Гэта «мірная» загартоўка потым вельмі спатрэбілася.

Праз 5 год ён быў накіраваны служыць у Афганістан. У яго распараджэнні было 10 баявых разведвальна-дазорных машын, з якімі ён суправаджаў калоны з грузамі. Грузам быў, у асноўным, авіяцыйны керасін. Практычна кожны рэйс калона абстрэльвалася. Як камандзір Сакалоўскі прыкладаў усе намаганні, каб выканаць пастаўленую баявую задачу і зберагчы людзей. Яму гэта ўдавалася, хаця, ён лічыць, што падраздзяленне аховы было занадта дробнай цэллю для душманаў. Вялікія страты цярпела аўтарота. Літаральна за два месяцы палова яе асабістага саставу звычайна выбівалася. Хаця ўсялякага было і ў падраздзяленні, якім камандаваў Сакалоўскі. Нездарма ён сам і некаторыя яго салдаты не раз прадстаўляліся да ўрадавых узнагарод. Праўда, многія ўзнагародныя лісты так доўга «хадзілі» па штабных кабінетах, што паспелі згубіцца. Старшага лейтэнанта Яўгена Сакалоўскага ордэн Чырвонай Зоркі знайшоў.

Калі вярнуўся у Саюз, многія пыталіся: ці адчувалі салдаты ў Афганістане страх перад смерцю? Яўген Іванавіч адказваў чэсна, што, канечне, адчувалі. Нельга не баяцца; у такім выпадку

чалавек страчвае пачуццё самазахоўвання, а між іншым, выконваючы любую баявую задачу, салдат павінен імкнуцца застацца жывым. Менавіта аб гэтым гаварыў заўтрашнім абаронцам Айчыны капітан запасу Я. П. Сакалоўскі на сустрэчы ў райваенкамаце. Ён раіў ім захоўваць воінскую дысцыпліну, бо гібель салдату мірны час, па яго словах, звычайна здараецца па прычыне разявацтва, няўважлівасці байцоў, іх уцёкаў у самаволкі і іншых парушэнняў дысцыпліны. Такія выпадкі нават у Афганістане былі прычынай таго, што нашы салдаты траплялі ў палон. Слухаючы мудрае выступленне Сакалоўскага, думаецца, што такіх людзей, як ён, трэба абавязкова прыцягваць да выхавання маладых хлопцаў, якім сёння не хапае жывога, некіношнага, прыкладу асобы сапраўднага мужчыны, які ведае, што такое абарона Радзімы, гонар, мужнасць, мужчынскае сяброўства.

Усяго гэтага багацця хапае ў Яўгена Іванавіча, але дзяліцца ім яму зараз надта што няма з кім. Сакалоўскі з сям'ёй жыве ў вёсцы Гірнава, куды ён вярнуўся пасля скарачэння, якое напаткала армію напачатку 90-х гадоў. Займаецца сельскай гаспадаркай і гэтым жыве. Тады, пасля Афгана, ён ніяк не мог думаць, што вельмі хутка настане час, калі яму прыйдзецца зняць пагоны, якімі ён заўседы так даражыў. «Чорныя» часы для арміі завяршыліся крушэннем лёсу многіх ваенных і стварэннем у грамадстве паняцця непатрэбнасці арміі, прыніжэння ваеннай прафесіі. Але так не можа быць. Любая, нават «карлікавая» дзяржава, абавязкова мае сваю армію, асноўная задача якой абараняць межы і незалежнасць гэтай дзяржавы. Зараз у краіне шмат робіцца для аднаўлення страчанага, але пройдуць гады, перш, чым зноў для мужчын самай прэстыжнай стане прафесія афіцэра. Праўда, пляменнік Яўгена Іванавіча ўжо сёння выбраў яе і, вядома ж, не без уплыву капітана запасу Сакалоўскага.

**Т. Альшэўская**